Усе гэта садзейнічае развіццю вобразнага мыслення студэнтаў на занятках фартэпічна.

Валузнева І.А.,
ст.выкладчык

## АБ РАЗВІЦЦІ ФАРТЭПІЯННАЙ ТЭХНІКІ Ў РАБОЦЕ СА СТУДЭНТАМІ

Праблема тэхнікі заўсёды хвалявала і хвалюе музыкантаў-выканаўцаў усіх узростаў і ўзроўняў. Ёсць шмат метадычных прац, прысвечаных пытанням гэтай тэхнікі.

Музычнае выкананне даволі разнастайнае па сваіх магчымасцях. Кожнаму студэнту трэба ведаць некалькі правіл «добрых паводзін у музыцы». Гэтыя правілы адносяцца да зместу і формы выканання, эстэтыкі гучання, педалізацыі і інш.

Музыка і тэхніка выканання музычных твораў знаходзяцца ў сувязі. Тэхніка - гэта не толькі чыстае выкананне музычнай фактуры, але і складанае аб'яднанне разнастайных кампанентаў. Адным словам, гэта ўменне выяўляць творчыя намеры, рэалізоўваць іх на практыцы.

Існуе памылковая думка, што ад тэхнікі залежыць у асноўным якасць выканання твора. Гэта не так. Над мастацкім вобразам трэба працаваць больш упарта, чым над тэхнікай, хаця, безумоўна, мастацкія і фізіялагічныя асновы ігры паміж сабой цесна ўзаемазвязаны.

У гісторыі піянізму погляды на фізіялагічны бок ігры змяняліся. Раней большае значэнне надавалася пастаноўцы рук і механічным практыкаванням. З цягам часу ў музыцы змяняюцца формы тэхнікі, эстэтычныя нормы і крытэрыі. Гэта студэнты павінны ведаць і рэалізоўваць на практыцы патрабаванні часу.

Барысава М.М.,
ст.выкладчык

## РОЛЯ АРТЫКУЛЯЦЫЙНАГА АПАРАТУ Ў ПРАЦЭСЕ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ГОЛАСУ

Ад спевака патрабуецца не толькі фарміраванне прыгожага музычнага тону, умела прапетага на ўсім дыяпазоне, але і адначасова дакладна выразнае данясенне да слухача сэнсу паэтычнага тэксту.

Непрыемнае ўражанне ствараецца пры няясным вымаўленні слоў. Якім бы прыгожым голасам ні валодаў выканаўца, якім бы ні быў ён таленавітым і музыкальным, але спевы не выклічуць патрэбнага ўражання, калі ў спевака не выпрацавана добрая дыкцыя. Дрэнная дыкцыя патрабуе напружваць слых, каб зразумець сэнс тэксту, і не дазваляе ў поўнай меры ўспрымаць прыгажосць голасу.

Няясная дыкцыя - вялікі недахоп спевака, гэта тэхнічная недапрацаванасць голасу, якая можа быць ліквідавана толькі працай. Для таго, каб тэкст вакальнай фразы быў натуральны, добра пачуты слухачамі, каб не страціліся вакальныя якасці голасу, будучыя хормайстры і выканаўцы павінны разабрацца ў рабоце артыкуляцыйнага апарату пры спевах. Мова складаецца з гукаў, якія ў межах слова ці сказа змяняюць адзін аднаго. Гукі мовы падзяляюцца на галосныя і зычныя, механізм утварэння іх розны, розныя яны па акустычных уласцівасцях.

У плыні мовы галосныя і зычныя нясуць неаднолькавую функцыю. На голас, яго эмацыянальную афарбоўку, моц і насычанасць гучання ўплываюць галоўным чынам галосныя гукі. Дакладная дыкцыя звязана з правільным вымаўленнем зычных. З 39 гукаў беларускай мовы толькі 5 чыстых галосных.

Звонкі, моцны, вольны, прыгожы ў тэмбравым сэнсе гук - важнейшы паказчык прафесійнага голасу. Спеваку трэба вымаўляць галосныя і зычныя гукі слова так, каб яны не парушалі кантыленнага характару, каб прыгожы пеўчы голас дакладна, выразна перадаваў меладычны малюнак твора. Таму спевы нельга разглядаць як расцягнутую мову. Спевы - вынік асобай каардынацыі ў рабоце галасавога апарату, гэта якасна іншае гучанне ў параўнанні са звычайнай мовай.

Розныя гукі мовы і іх спалучэнні ўздзейнічаць на работу галасавога апарату ў жаданым напрамку. Спевы ажыццяўляюцца на галосных гуках, і таму галосныя павінны быць аб'ектам асаблівай увагі студэнта пры навучанні спевам. Мэта студэнта - на найбольш вакальна моцным гуку выпрацаваць лепшыя пеўчыя якасці і затым перанесці іх на іншыя гукі. Практычна гэта вырашаецца па-рознаму, таму што галасавы апарат пабудаваны вельмі індывідуальна. Неабходна захаваць натуральнасць слоў, не парушаючы музычнай фразы, яе руху і кульмінацыі.

У рабоце над творам трэба прааналізаваць тэкст, знайсці музычныя і славесныя націскі і пры штодзённай працы над творам сачыць за правільнасцю размяшчэння чыстых і змешаных галосных. Уменне перанесці ў спевы элементы моўных інтанацый і акцэнтаў робіць словы выразнымі.